# ПОСПЕХАЎ У НОВЫМ НАВУЧАЛЬНЫМ!

*По меры навуковага і тэхнічнага прагрэсу далейшае развіццё атрымае вышэйшая і сярэдняя адукацыя, заклікаяная рыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, валодаючых шырокім тэарэтычным і палітычным кругаглядам*

(З Праграмы Камуністычнай партыі Савецкага Саюза).


Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя Ул. І. ЛЕНІНА

№ 22 (610) Пятніца, 3 верасня 1965 г. Год выдання XVIII Цана 1 кап.


## ДАРАГІ ПЕРШАКУРСНІК!

Вось надыйшоў дзень, калі збылася твая мара. Ты стаў студэнтам Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя Уладзіміра Ільіча Леніна. Гэты слаўны дзень назаўсёды застанецца ў тваёй памяці, таму што перад табой адкрылася новая старонка твайго жыцця. Тысяча трыста юнакоў і дзяўчат прыйшло ў гэтым годзе ў нашу слаўную студэнцкую сям'ю. На цэлых пяць год родным і жаданым для вас будзе універсітэт. Стаць студэнтам — гэта сапраўднае шчасце. Але гэта не дае вам ніякага права зазнавацца, лічыць сябе чалавекам асаблівага складу і патрабаваць да сябе нейкіх асобных адносін.

За гады вучобы ва універсітэце вам прыйдзецца прайсці вялікі і цікавы шлях — шлях ад першакурсніка да выпускніка. Вы, сённяшнія першакурснікі, праз пяць год станеце гісторыкамі, матэматыкамі, фізікамі, хімікамі, географамі, біёлагамі, юрыстамі, філолагамі. Цяпер вас чакаюць хваляванні перад дзвярыма аўдыторый, у час сесій, спрэчкі аб рознастайных навуковых праблемах, бяссонныя ночы за падручнікамі, захапляючыя студэнцкія песні, эшалоны, што ад'язджаюць на будоўлі цаліны, цікавыя студэнцкія вечары, турысцкія паходы — усё тое, без чаго нельга уявіць студэнцкага жыцця.

Першакурснік, пераступіўшы парог БДУ імя Ул. І. Леніна, не губляй гонару і славы нашых камсамольскіх спраў. Ты паступіў у калектыў, дзе паважаюць чалавека за прыгожыя якасці яго душы. Памятай, што ў нас многа цікавых камсамольскіх спраў.

Па-першае, вучоба, праца ў школе і на будоўлях розных прадпрыемстваў, праца з рабочымі саўгасаў і калгасаў, фабрык і заводаў Беларусі. Вас чакае і кліча рамантыка суровых будняў. Слова «цалліннікі» стала родным і блізкім для многіх нашых студэнтаў. А цяпер, дружа, гэта чакае і цябе.

У нас ёсць усе ўмовы для паспяховай вучобы, выдатныя карпусы, чытальныя залы, багатыя бібліятэкі, добра ўпарадкаваныя кабінеты і лабараторыі.

А наш горад, у якім ты вучышся, дае ўсе магчымасці для таго, каб ты змог цудоўна правесці свой вольны час.

Пяцьсот выпускнікоў пакінулі сцены нашага універсітэта ў гэтым годзе. Сярод іх сотні выдатнікаў вучобы, актыўныя ўдзельнікі грамадскага жыцця універсітэта. Вельмі хацелася б, каб эстафету добрых спраў нашых выпускнікоў кожны з вас пранёс праз усе пяць студэнцкіх год.

Як гэта гаворыцца ў студэнтаў: «Ні пуха ні пяра!».

**Г. РЫЛЮК.**
**Сакратар камітэта камсамола БДУ імя Ул. І. Леніна**

## ПРЫВІТАННЕ, УНІВЕРСІТЭТ!

(рэпартаж)

Урачыстасць гэтай хвіліны не забудуць ніколі 200 юнакоў і дзяўчат, якія сабраліся нядаўна на традыцыйную сустрэчу ў гуманітарным корпусе нашага універсітэта. Гэтыя з віхрастымі чубамі хлопцы і яшчэ са школьнымі касічкамі дзяўчынкі пераступілі парог навучальнай установы. Называюць іх—першакурснікамі. Першакурснік, нібы першаадкрывальнік. Ён перагарнуў сёння новую старонку ў сваёй біяграфіі—першую старонку жыцця ва універсітэце. Кафедра, аўдыторыя, прафесарская, дэканат, студэнт — якія гэта ўрачыстыя для першакурсніка словы!

З заміраннем сэрца слухаюць яны віншаванне намесніка дэкана філалагічнага факультэта Аляксея Арсеньевіча Волка:

«Шчаслівым—шчаслівай дарогі!»

З-за стала прэзідыума падніжаецца прафесар Міхаіл Рыгоравіч Ларчанка:

— Наш факультэт мае добрую традыцыю вучыцца «добра» і «выдатна». Гэтую традыцыю вы павінны заўсёды падтрымліваць, ніколі не забывацца аб ёй.

Шырока раскрытымі вачыма першакурснікі глядзяць на «жывога» пісьменніка, аўтара «Бульбы»—Івана Навуменку:

— Археолагі робяць раскопкі,—гаворыць ён, — вывучаюць таямніцы зямлі. А філолагі вывучаюць слова. Дык вывучайце яго настойліва і ўпарта...

— Каб не былі вы весляром, які плыве супраць цячэння і падняў на момант вёслы,—падхоплівае думку Івана Навуменкі заслужаны дзеяч навукі БССР Міхаіл Іванавіч Жыркевіч...

У зале—мёртвая цішыня. І раптам на трыбуну выбягае ўсхваляваная дзяўчынка Ала Цітова:

— Як гэта здорава, таварышы, што я паступіла ва ўніверсітэт!.. Ад імя першакурснікаў хачу запэўніць прафесарска-выкладчыцкі калектыў і старшакурснікаў у тым, што мы будзем вучыцца толькі на «добра» і «выдатна»!..

Цёплыя словы віншаванняў гучаць і гучаць у зале:

«Добры дзень, племя маладое, незнаёмае!»

«У добрую дарогу, сябры!»

«Няхай жа так слаўна і шчаслівa ідзе ваша вучоба, як шчасліва вы пераступілі парог сапраўднага храма навукі!»

**М. ЦІВА,**
**В. А. сакратара ЛКСМБ філфака БДУ імя Ул. І. Леніна.**

## ТАК ТРЫМАЦЬ І НАДАЛЕЙ

Для тых, хто сёння першакурснік універсітэта, варта ўспомніць аб прыёмных экзаменах, бо гэта быў самы адказны момант у іх жыцці. Па-сутнасці іменна тады, паспяхова вытрымаўшы конкурсныя экзамены, яны пераступілі парог універсітэта як будучыя студэнты. Успомніць аб экзаменах варта яшчэ і таму, што кожнаму з сённяшніх студэнтаў прыйшлося нямала папрацаваць, каб авалодаць ведамі і як належыць падрыхтаваць сябе да ўспрыняцця універсітэцкай праграмы. Ва універсітэце ж ім прыдзецца працаваць яшчэ болей.

А экзамены праходзілі ў напружанай абстаноўцы. Адна з аўдыторый галоўнага корпуса... Каля дзвярэй цеснымі купкамі стаяць абітурыенты. Хвалююцца. Ідзе экзамен па фізіцы. За сталом экзаменатараў выкладчыкі Анна Васільеўна Шыбаева і Анатоль Іванавіч Камяк.

— Ну, хто падрыхтаваўся? — пытаюцца экзаменатары.—Калі ласка!

Да экзаменацыйнага стала падыходзіць выпускнік адной з аршанскіх сярэдніх школ Леанід Твердамент. Гаворыць ён паволі, але затое кожнае слова сведчыць аб глыбокім веданні матэрыяла тэорыі хістанняў у прыродзе, квантавай тэорыі, фотаэлементаў і г. д. Заслужаная «пяцёрка».

Затым адказы ідуць значна слабейшыя. Доўгі роздум дапамагае не ўсім. З'яўляюцца «тройкі», а часам і «двойкі».

Неўзабаве падыходзіць чарга і да абітурыента ў вайсковай форме — Валодзі Гомазава. Адказ Валодзі слухае Анна Васільеўна. Ніводнага ўдакладнення—усё правільна. А задачы? Іх Валодзя рашае імгненна. Зноў «выдатна».

Тым, аб якіх мы сёння расказваем і каго віншуем з паступленнем ва універсітэт, нялёгка дасталіся веды. Яны — вынік вялікай працы. Дык пажадаем жа ім і надалей не забываць, што дарогі да вяршынь навукі ляжаць праз паўсядзённую і настойлівую вучобу.

**Ул. БЛАКІТНЫ.**



З уступных экзаменаў. Так усміхаюцца экзаменатар і абітурыент, калі усё ідзе на лад.

## САРДЭЧНА ВІНШУЮ

*(Слова леташняга выпускніка аддзялення журналістыкі).*

Дарагія студэнты-першакурснікі! Сёння перад вамі гасцінна адчыніліся дзверы аўдыторый. Смялей крочце ў іх, бо з цяперашняга часу тут будуць праходзіць нялёгкія вашы дарогі пазнання вышынь навукі. У іх вы зможаце глыбей пазнаць свет, цуды навукі і тэхнікі. Пра яе вам заўсёды па-бацькоўску, шчыра і сардэчна раскажуць нашы настаўнікі—выкладчыкі універсітэта.

Ад усяго сэрца шчыра і сардэчна віншую вас з паступленнем ва універсітэт, які носіць імя вялікага правадыра народаў Уладзіміра Ільіча Леніна!

**А. РАБЦАЎ,**

## УЗНАГАРОДЫ ЎЗНАГАРОДЖАНЫХ

Першыя дні ва універсітэце... Віншаванні, знаёмствы з новымі людзьмі, абставінамі жыцця і вучобы. Для кожнага студэнта першакурсніка гэтыя ўражанні запомняцца на ўсё жыццё. І асабліва першыя весткі, першыя віншаванні аб залічэнні ва універсітэт. Для адных гэтыя весткі прыляцелі па пошце, другія самі ўбачылі свае прозвішчы ў загадзе рэктара, трэція пачулі іх найперш за ўсіх—у дні прыёмных экзаменаў. Гэта выпускнікі сярэдніх школ і навучальных устаноў, узнагароджаныя залатымі і сярэбранымі медалямі Здаўшы экзамены па першаму прадмету на «пяць», яны ведалі, што дзверы універсітэта для іх адкрыты. Ужо на субяседаванні мы размаўлялі з імі, як з будучымі студэнтамі.

...Аўдыторыя 314. Дэкан гістарычнага факультэта Пётр Захаравіч Савачкін і дацэнт Марыя Парфіраўна Баранава, вядуць субяседванне з абітурыентамі, здаўшымі паспяхова экзамены. Адным раяць лепш рыхтавацца і паступаць на наступны год, другім—чакаць рашэння прыёмнай камісіі. Ну, а з Тамарай Бяляўскай размова асобная. Яна закончыла педагагічнае вучылішча з «адзнакай» і здала залікoвы прадмет на «пяць». Пётр Захаравіч дабразычліва пытаецца:

— Значыць, рашылі стаць педагогам?

— Але, гэта мара маиго жыцця,—з задавальненнем адказвае яна.

— Тады віншую вас з паступленнем ва універсітэт.

Тут жа на субяседаванні віншуюць з паступленнем ва універсітэт медалістаў Тацяну Глушакову, Вікенція Іванчыка, Раю Крапівіну, Аню Сурмач.

Для іх пасля ўзнагароды залатымі і сярэбранымі медалямі гэта была новая і не менш значная ўзнагарода.

І мы віншуем з узнагародай узнагароджаных!

**Ул. КУЛАЖАНКА.**

# НЯХАЙ МАЦНЕЕ ДРУЖБА!

## БРАТНЯЕ ПРЫВІТАННЕ НАРОДУ ДЭМАКРАТЫЧНАГА В'ЕТНАМА!

**Бюро Міжнароднай федэрацыі дэмакратычнай моладзі нядаўна зрабіла прэс-канферэнцыю, на якой віцэ-прэзідэнт МФДМ Патрысіо Вальдэс расказаў аб дзеяннях дэмакратычных маладзёжных арганізацый, накіраваных супраць агрэсіі амерыканскага імперыялізму ва В'етнаме. Мы, сказаў ён, поўнасцю салідарны з заявай урада ДРВ, у якой выражаецца рашучы пратэст супраць адпраўкі ў Паўднёвы В'етнам амерыканскіх войск і расшырэння агрэсіі. П. Вальдэс расказаў аб шматлікіх прыкладах баявой салідарнасці і канкрэтнай дапамогі, якую моладзь усяго свету аказвае в'етнамскаму народу.**

**Сёння, як ніколі раней, дэмакратычная моладзь свету павінна выразіць сваю салідарнасць з в'етнамскімі братамі.**

**МФДМ заклікае моладзь свету выступіць супраць імперыялістычнай агрэсіўнай палітыкі і інтэрвенцыі. МФДМ заклікае моладзь свету прыняць усе неабходныя меры для канкрэтнага выражэння сваёй палітычнай і матэрыяльнай салідарнасці з в'етнамскімі патрыётамі, МФДМ заклікае ўсе свае арганізацыі садзейнічаць поспеху «каравана міжнароднай салідарнасці» — кампаніі па збору і пасылцы в'етнамскай моладзі медыкаментаў, медыцынскага абсталявання і грашовых сродкаў як канкрэтнага ўкладу моладзі свету ў канчатковую перамогу в'етнамскага народа.**



Беларускія і в'етнамскія студэнты у хімічнай лабараторыі універсітэта.

# ВЯРНУЛІСЯ ДАДОМУ ЦАЛІННІКІ

**І вось зноў мітынг на Прывакзальнай плошчы. Студэнт нашага універсітэта Валянцін Гладышаў ад імя тысяч студэнтаў-цалліннікаў дакладвае: заданні перавыкананы па ўсім паказчыкам.**

**Лёгка сказаць перавыкананы. Для кожнага цаліннніка за гэтымі словамі і неміласэрдна гарачае сонца, свінцовая стома мускулаў у канцы працоўнага дня і радаснае ўсведамленне споўненага абавязку. Аб гэтым і гаворыць у сваім выступленні намеснік камандзіра Чапаеўска-Тайпакскага раённага атрада Уладзімір Вялічка.**

(Матэрыялы аб цалінніках чытайце у наступных нумарах нашай газеты).



З летніх будняў геафакаўцаў.

# Пісьмо з Алжыра

**Дзе б ні працавалі нашы студэнты—ці на цаліне, ці на будоўлях прадпрыемстваў і калгасаў—усюды яны з гонарам нясуць высокае званне студэнта нашага універсітэта. Таму не дзіўна, што ва універсітэт часта прыходзяць пісьмы-падзякі з розных устаноў нашай краіны і з-за мяжы. Адно з такіх пісем мы атрымалі нядаўна з Алжыра.**

**Паважаныя таварышы!**

Мы рады паведаміць вам аб стараннай рабоце студэнтаў Беларускага Дзяржаўнага універсітэта імя Ул. І. Леніна, якіх вы паслалі для будаўніцтва жылых дамоў у Алжырскай Народна-Дэмакратычнай Рэспубліцы.

Вашы студэнты Уладзімір Ладысеў і Уладзімір Бубноў працуюць у складзе беларускага атрада на будаўніцтве нашага Мінскага пяцішпакаёвага дома.

Уладзімір Бубноў з першых жа дзён работы стаў выдатным тынкоўшчыкам, а Уладзімір Ладысеў выдатным муляром. Хлопцы на «выдатна» спраўляюцца са сваёй працай і паспяхова пераносяць цяжкія для іх кліматычныя ўмовы. Работа на нашым будынку заканчваецца, і цяпер ужо вядома ўсім, што ён будзе здадзены ў першую чаргу. У гэтым вялікая заслуга і вашых студэнтаў. Заслуга іхняя яшчэ і ў тым, што наш самы вялікі атрад (18 чалавек) ужо двойчы за гэты кароткі час заваяваў пераходны сцяг ЦК ВЛКСМ.

Ад імя кіраўніцтва атрада запэўніваем, што БДУ імя Ул. І. Леніна можа ганарыцца сваімі пасланцамі ў Алжырскую рэспубліку. Мы шчыра дзякуем вам за добрых і сумленных таварышаў.

Парторг атрада Скайбеда.
Камсорг атрада Громаў.

# ЧАМУ Я ХАЧУ СТАЦЬ ФІЛОЛАГАМ

**Перад намі мноства сачыненняў. Яны напісаны на розныя тэмы, рознымі почыркамі, рознымі стылямі і чарнілам. Вось адно сачыненне, напісанае цвёрдым, сталым почыркам. А вось другое, па ўсім відаць, што сачыненне ўчарашняга школьніка — акуратна і прыгожа выведзены вялікія роўныя літары на ўсіх шасці старонках. Кожны абітурыент мог пісаць на сваю любімую тэму, а тэм было многа. Тут і пра любімых герояў з творчасці М. Ю. Лермантава, А. С. Пушкіна, А. М. Горкага, Я. Коласа, Я. Купалы і многа іншых.**

**Але большасць сачыненняў абітурыенты пісалі на вольную тэму. Усе яны захапляючыя, цікавыя, цесна звязаныя з жыццём школьніка, а сёння — студэнта. Адно з такіх сачыненняў мы друкуем у нумары нашай газеты.**

*Вось як гэта пачалося...*

*Не хачу паганіць імя настаўніка беларускай мовы і літаратуры. Можа ён падумаў, што мы ў дзесятым класе не дараслі яшчэ да таго, каб ведаць, што такое філолаг... Але ўсё ж памятаю: «Філолаг, рабяты, — гэта пісака». І яшчэ настаўнік сказаў: «На наступны раз прынесці кожнаму па вершу».*

*...Прынеслі. Кожны чытаў свой верш — і кожнага настаўнік хваліў.*

*А я свой не прачытаў. Я напісаў у сваім вершы пра вясну, пра сонца, пра мір, пра вербалоз, які зацвіў. Свой верш я паказаў настаўніку, калі застаўся адзін на адзін з ім у класе. Мы доўга гаварылі. Я памятаю задумёныя вочы настаўніка і яго словы, цёплыя і шчырыя, бацькоўскія: «Пішы, Толя, не кідай...».*

*І я пісаў. Кожны дзень прыносіў настаўніку па пяць-шэсць вершаў. Усе яны былі не дай бог якія, бо настаўнік (я гэта добра памятаю) хмурыў свае бровы і казаў: «Эх ты, філолаг!..».*

*Але вершаў з пяць паслалі ў раённую газету і адзін з іх надрукавалі. Ён называўся «Чытае мама».*

*Атрымаў ганарар, абрадаваўся і падумаў: «Я—філолаг».*

*Пасля быў ліст з другой газеты. Вось што пісалася ў ім: «Паважаны таварыш!.. Вершы ў вас не атрымаліся... Вы не можаце знаходзіць трапныя словы — вясёлыя, вобразныя...». У мяне, калі чытаў, спачатку рукі задрыжэлі, пасля — каленкі, пахаладзела на сэрцы, на твар бы нехта гарачай вады лінуў...*

*Але пісаць не пакідаў. Слаў яшчэ вершы разоў са тры. І кожны раз такі адказ: «Няма яркіх, вобразных, вясёлых слоў»... Злосць мяне брала ад такіх адказаў!..*

*Знайшоў у зборніку Ніла Гілевіча эпіграму «Аднаму літкансультанту». Вось яна:*

*Кансультант ты ў нас вядомы,*
*Шлеш парады ўсім без стомы.*
*Толькі знаеш, брат,*
*Час прыслухацца й самому*
*Да сваіх парад...*

*І вось гэтую эпіграму — літкансультанту. Можа, кепска я зрабіў, але чаго не зробіш, калі хочаш стаць філолагам?!*

*Прайшло яшчэ некалькі часу.*

*Аднойчы прыходжу дамоў (я пасвіў кароў — была якраз наша чарга) і бачу — мяне на семінар маладых пісьменнікаў і паэтаў выклікаюць!*

*У Каралішчавічах нас, пачынаючых, было чалавек з трыццаць. Многа гаварылі мы аб паэзіі, аб літаратуры. Вершы мае разграмілі ўшчэнт... Было сумна. Доўга ў адзіноце блукаў па лесе. Думаў, марыў. І зноў сумаваў. Хацелася пісаць не так, як пісаў раней. Але як — і сам не ведаў...*

*Пасля заканчэння школы працаваў на экскаватары. Побач былі такія цудоўныя людзі! Сцяпан, машыніст. Ён працаваў, калі трэба было, суткі не пакідаючы рычагоў. Васіль — другі машыніст. І мне захацелася напісаць пра іх. І я напісаў. У тую газету, дзе надрукавалі мой першы верш.*

*Пісаць стаў пасля гэтага многа і заўзята. Друкавалі многа. Неўзабаве мяне запрасілі на працу ў рэдакцыю. Аб'ездзіў амаль увесь раён, кожны дзень знаходзіўся сярод цудоўных людзей. Хвалілі мяне за ўдалыя замалёўкі. А вось на тэмы эканомікі пісаць не ўмеў. Некалькі разоў не выконваў заданняў рэдакцыі. Сорамна мне было за гэта перад рэдактарам і таварышамі.*

*...Трэба вучыцца. Трэба вучыцца пісаць пра ўсё: людзей, жыццё, быт і змаганне за камуністычнае заўтра.*

*Вось і ўсё. Што тут больш нагішаш, калі хвалюешся (экзамены ж), калі дрыжаць рукі?..*

*Анатоль КАЗЛОВІЧ.*

**Чарговае паседжанне літаб'яднання «Узлёт» адбудзецца ў сераду 8-га верасня ў памяшканні рэдакцыі а 6-й гадзіне вечара.**

# КАЛІ ЛАСКА, ДА НАС!

**Бібліятэка нашага універсітэта — адна з буйнейшых у рэспубліцы. Становячыся студэнтам, вы можаце карыстацца ёю. У выбары патрэбных кніг вам дапамогуць высокакваліфікаваныя бібліятэкары і бібліёграфы. У бібліятэцы рэгулярна праводзяцца агляды мастацкай, навуковай і спецыяльнай літаратуры, выстаўкі, цікавыя лекцыі і літаратурныя вечары, дыспуты і канферэнцыі чытачоў. У бібліятэцы створаны ўсе ўмовы для працы чытача з кнігай. Ніжэй мы друкуем правілы карыстання бібліятэкай.**

### I. Агульныя палажэнні

Запіс чытачоў праводзіцца пры прад'яўленні пашпарта і студэнцкага білета, службовага пасведчання, на падставе якіх бібліятэка выдае пастаянны адзіны білет чытача. Бібліятэка БДУ штогод праводзіць перарэгістрацыю чытачоў. Пры перарэгістарацыі чытач павінен здаць для ўліку літаратуру, якая лічыцца за ім і якую ён зможа атрымаць зноў пасля перарэгістрацыі. Чытачы, якія не прайшлі перарэгістрацыі, бібліятэкай не абслугоўваюцца.

Студэнты і аспіранты перад летнімі канікуламі павінны здаць усе кнігі, якія лічацца за імі.

Аб змяненні месца работы, вучобы або адраса чытач павінен паведаміць у бібліятэку ў 10-дзённы тэрмін.

### II. Парадак карыстання літаратурай

#### а) На абанеменце

Навуковая літаратура выдаецца чытачам на тэрмін да двух месяцаў.

Тэрмін карыстання кнігай можа быць прадоўжаны пры ўзгадненні з работнікамі абанемента.

Для студэнтаў-завочнікаў тэрміны карыстання падручнікамі ўстанаўліваюцца ў залежнасці ад тэрмінаў правядзення лабараторна - экзаменацыйных сесій.

Не выдаюцца на дом рэдкія і каштоўныя выданні, дысертацыі, аўтарэфераты, рэфератыўныя часопісы, газеты, а таксама кнігі, атрыманыя па міжбібліятэчнаму абанементу.

У выпадку затрымкі кніг звыш устаноўленага тэрміну без уважлівых прычын чытач пазбаўляецца права карыстання бібліятэкай на 1—2 месяцы.

Па міжбібліятэчнаму абанементу літаратура выдаецца абанементам на адзін месяц.

#### б) У чытальных залах

Кнігі з дапаможных фондаў чытальных залаў кнігасховішчаў выдаюцца па вуснаму патрабаванню або патрабавальных лістках.

Выносіць кнігі з чытальнай залы не дазваляецца. Выходзячы з чытальнай залы на працяглы час, чытач павінен здаць кнігі дзяжурнаму бібліятэкару.

Кнігі з кабінетаў і лабараторый на дом не выдаюцца.

Рэдактар А. А. ЛОЙКА.

АТ 02116 Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19. Друкарня Выдавецтва «Звязда» Зак. № 969. Тыр. 2000.